# Не пакідайце танец, «каб не ўмёрлі»



У беларусаў, безумоўна, вельмі яскравая, самабытная і цікавая культура. Апошнім часам назіраецца асаблівае павышэнне яе папулярнасці сярод беларускай моладзі. На жаль, большасць нашага насельніцтва не мае яшчэ ніякага ўсведамлення і паняцця аб культуры свайго народа. А нярэдка сустракаюцца людзі з негатыўным стаўленнем і тыя, хто знаходзіцца ва ўладанні стэрэатыпаў.

Навукоўцы і практыкі імкнуцца змяніць такую сітуацыю. Па ўсёй краіне дзейнічаюць фальклорныя гурты на базе цэнтраў пазашкольнай адукацыі, суполкі ў каледжах і ўніверсітэтах, установах культуры. Аднак у гэтых супольнасцях не заўсёды выкарыстоўваюцца сродкі, блізкія да традыцыйнай культуры. Даволі часта бачная тэндэнцыя, калі класічная традыцыя бярэцца толькі за аснову. У выніку атрымліваецца своеасаблівая «акадэмізацыя» і перааппрацоўка аўтэнтычнага фальклору.

Ёсць і цудоўныя прыклады, калі педагогі бяруць выключна традыцыйную сістэму. Мне давялося пазнаёміцца і стаць удзельнікам такой з'явы.

Я студэнт пятага курса кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Пры вызначэнні дадатковай «дысцыпліны па выбары» наш курс абраў «Народны танец» пад кіраўніцтвам фалькларыста, этнахарэографа Міколы Козенкі. Цягам курса мы навучаліся праз мастацтва вуснага пераймання. Вучылі традыцыйныя танцы традыцыйнымі педагагічнымі сродкамі пад акампанемент беларускай дуды, дудкі, бубна і гармоніка. У выніку за кароткі час (усяго адзін семестр) мы навучыліся танчыць каля шасцідзесяці традыцыйных народных беларускіх танцаў з розных рэгіёнаў. Гэта былі: сольныя імправізацыйныя танцы, парныя і нават зніклыя кадрылі – «Вяліказімовіцкая» (Мазырскі раён), «Ленцяя» (Сенненскі раён) і іншыя. Усе ўдзельнікі-студэнты атрымалі вялікую асалоду, а таксама раскрылі свой творчы патэнцыял і тэмперамент з іншага, мастацкага, боку.

Кантролем для гэтай дысцыпліны быў залік – практычны паказ «напрацаванага» ў форме клас-канцэрта (доўжыўся звыш дзвюх гадзінаў) з поўным каментарам. На ўнікальным фальклорна-танцавальным свяце (інакш і не скажаш) прысутнічалі вядомыя спецыялісты ў галіне традыцыйнай культуры, кіраўнікі мінскіх фальклорных калектываў, студэнты з харэаграфічнай і іншых кафедраў універсітэта, карэспандэнты агульнанацыянальных СМІ Рэгіна Гамзовіч, Марына Весялуха, Алена Ляшкевіч. Наш вынік быў высока адзначаны знанымі навукоўцамі і выкладчыкамі прафесарамі Тамарай Варфаламеевай, Аляксеем Рагулем, Энгельсам Дарашэвічам ды іншымі прысутнымі.

У М. Козенкі ёсць шмат праектаў, звязаных з побытавымі народнымі танцамі, і нават агульнадаступны клас навучання танцам. Усе ўдзельнікі праекта згодныя з тым, што гэта выключная і вельмі цікавая справа. Яна раскрывае нашыя тэмперамент, скрытыя творчыя магчымасці, дапамагае актыўнаму і свядомаму ўваходжанню ў беларускасць.

Удзельнікі традыцыйных танцавальных майстэрняў прапануюць усім, ад малога да вялікага, звярнуць увагу на традыцыйны беларускі побытавы танец, на гэтую непаўторную прыгажосць беларускай культуры.

*Мікіта ХАЛЬКОЎ*

РЕПОЗИТОРИЙ